ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ

№ 3 (1036) | ЧАЦВЕР, 13 лютага 2003 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

Падзеі, навіны, факты

## СВЯТКАВАЛІ ДЗЕНЬ НАВУКІ

У абласным драматычным тэатры адбыўся ўрачысты сход навуковай грамадскасці, прысвечаны Дню беларускай навукі. Па добрай традыцыі штогадовае свята навукоўцаў становіцца своеасаблівым аглядам дасягненняў вучоных. Падводзяцца вынікі іх дзейнасці, аналізуюцца дасягненні ў сферы фундаментальных навук, прыкладных распрацовак, ушаноўваюцца тыя, хто дасягнуў значных поспехаў, зрабіў цікавыя адкрыцці.

З дакладам аб выніках работы ВНУ і НДІ Гомельшчыны на ўрачыстым сходзе выступіў рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта транспарту доктар тэхнічных навук, прафесар В.І. Сянько, які грунтоўна ахарактарызаваў іх дасягненні, назваў асноўныя прыярытэтныя накірункі дзейнасці вучоных, што прыносяць канкрэтныя вынікі для народнай гаспадаркі, расказаў пра высокі навуковы патэнцыял Гомельшчыны, адзначыўшы пры гэтым, што самая навукаёмістая прадукцыя – гэта спецыялісты з вышэйшай адукацыяй.

З прафесіянальным святам цёпла і сардэчна павіншавалі вучоных намеснік старшыні аблвыканкама В.А.Кляблееў, старшыня абласнога Савета дэпутатаў В.С. Сяліцкі, першы намеснік старшыні Гомельскага гарвыканкама М.Д. Усаў, старшыня Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў У.С. Чарнаштан, намеснік старшыні Камітэта па навуцы і тэхналогіях пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь У.Б. Пранові, віцэ-прэзідэнт, член-карэспандэнт НАН Беларусі Ю.М. Плескачэўскі.

За плённую дзейнасць і вялікі ўклад у развіццё беларускай навукі група вучоных атрымала Ганаровыя граматы, многім была аб'яўлена падзяка.

Сярод узнагароджаных – дацэнт кафедры беларускай літаратуры нашага універсітэта В.С.Новак, якая ўдастоена Ганаровай граматы аблвыканкама, а таксама асістэнт кафедры хіміі А.В. Вараб'ёва і аспірант фізічнага факультэта Я.А. Патапёнак. Яны атрымалі Дыпломы лаўрэатаў як пераможцы абласнога конкурсу сярод маладых вучоных і спецыялістаў.

Удзельнікам урачыстасці сваю цікавую і арыгінальную канцэртную праграму паказалі творчыя калектывы БелДУТа.

## "НІКА" – НАШАЙ ГАЗЕЦЕ

Не першы год да Дня беларускай навукі рэдакцыя абласной газеты "Гомельская праўда" праводзіць агляд-конкурс насценнага друку і шматтыражных газет вобласці, у якім вызначае пераможцаў за лепшае асвятленне навуковай тэматыкі.

Сёлета лепшай сярод шматтыражных газет вобласці члены журы назвалі наша выданне – "Гомельскі універсітэт". Яго калектыў удастоены Ганаровай граматы і спецыяльнага прыза – крылатай "Нікі", якія рэктару ГДУ прафесару М.В. Селькіну на ўрачыстым сходзе ў драмтэатры ўручыла рэдактар аддзела адукацыі, навукі і культуры абласной газеты А.Ф. Клыга.

## АБ ГІСТОРЫІ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

Юбілейнай даце – 65-годдзю з дня заснавання Гомельскай вобласці прысвячаўся круглы стол, які арганізавалі ўпраўленне інфармацыі і друку аблвыканкама, абласныя універсальная бібліятэка імя У.І. Леніна і краязнаўчы музей, вучоныя-гісторыкі нашага універсітэта.

Вёў пасяджэнне дэкан гістарычнага факультэта ГДУ, к.г.н., дацэнт М.І. Старавойтаў. Умоўна былі перагорнуты старонкі гісторыі стварэння Гомельшчыны. Прагучалі цікавыя паведамленні нам.дырэктара абласнога краязнаўчага музея У.А. Ліцвінава, навуковага супрацоўніка Ю.Э. Глушакова, вядучага спецыяліста абласной бібліятэкі Т.І. Міхалькевіч, старшыні Гомельскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі В.Ю.Ткачова, члена прэзідыума Гомельскага аддзялення Саюза філатэлістаў Беларусі У.С. Ларыёнава, у якіх асвятляліся палітычная сітуацыя напярэдадні ўтварэння Гомельскай вобласці, станаўленне і развіццё ў ёй бібліятэчнай справы, творчасць нашых пісьменнікаў-землякоў, адлюстраванне гісторыі вобласці ў філатэліі і інш.

Актыўным быў удзел у пасяджэнні круглага стала вучоных кафедры гісторыі Беларусі ГДУ – яе загадчыка к.г.н. В.П. Пічукова, які расказаў аб этнатэрытарыяльным феномене Гомельшчыны ў 1920-1930 г.г., к.г.н. А.І.Зелянковай, паведамленне якой прысвячалася дзейнасці Гомельскага педагагічнага музея, і дэкана гістфака М.І.Старавойтава. Яго выступленне асвятляла адміністрацыйна-тэрытарыяльныя змены Гомельшчыны ў 1919-1938 г.г.

У рамках юбілею разнастайныя мерапрыемствы будуць праведзены таксама ў студэнцкіх групах гістарычнага факультэта.

## ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОЦЕ– БОЛЬШ УВАГІ

Адбылося чарговае пасяджэнне каардынацыйнага савета ГДУ па выхаваўчай рабоце, якое правёў прарэктар А.В. Лысянкоў. На ім абмеркавана пытанне аб арганізацыі выхаваўчай работы ў інтэрнатах, дзе, на жаль, яна праводзіцца не на належным узроўні. Аб гэтым сведчаць выпадкі парушэння іх жыхарамі правілаў пражывання. Ішла размова аб узмацненні выхаваўчай работы сярод студэнцкай моладзі, неабходнасці рэгулярнага наведвання інтэрнатаў куратарамі, нам.дэканаў факультэтаў па выхаваўчай рабоце з мэтай папярэджання, недапушчэння ў маладзёжным асяродзі амаральных паводзін.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

За высокія вынікі, дасягнутыя ў навуковай і педагагічнай дзейнасці, значны ўклад у арганізацыю навуковых даследаванняў і ў сувязі з Днём беларускай навукі вядучы інжынер НДС **ТВАРДОЎСКІ Міхаіл Іванавіч** узнагароджаны Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

***

За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Ганаровай граматай універсітэта ўзнагароджана ст.выкладчык кафедры нямецкай мовы **МАКУШЫНСКАЯ Тамара Рыгораўна**.

***

За плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў Ганаровай граматай універсітэта ўзнагароджана ст.выкладчык кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў **САКАЛОВА Эмілія Аляксандраўна**.

## УДАСТОЕНЫ ДЫПЛОМАЎ

*За якаснае кіраўніцтва навуковымі даследаваннямі студэнтаў Дыпломаў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь удастоены заг.кафедры эканамічных тэорый дацэнт* ***САРВІРАЎ Барыс Уладзіміравіч****, дацэнт кафедры гісторыі славян і спецыяльных гістарычных дысцыплін* ***МАКУШНІКАЎ Алег Анатольевіч****, дацэнт кафедры беларускай літаратуры* ***ШЫНКАРЭНКА Вольга Карпаўна****, дэкан фізічнага факультэта дацэнт* ***ШАЛУПАЕЎ Сяргей Вікенцьевіч****, дэкан геолага-геаграфічнага факультэта дацэнт* ***ГУСЕЎ Андрэй Пятровіч****.*

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

На пашыраным пасяджэнні Савета ГДУ, якое адбылося ў апошні чацвер студзеня, заслухана грунтоўная справаздача прарэктара па навуковай рабоце прафесара Д.Р.Ліна аб выніках навукова-даследчай работы універсітэта за 2002 год. Яго выступленне суправаджалася дэманстрацыяй слайдаў, якія мовай лічбаў, дыяграм дапаўнялі агульную карціну спраў і дасягненняў прафесарска-выкладчыцкага калектыву, НДС універсітэта ў навуковай сферы. Ён расказаў таксама аб рэфарміраванні Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі, яе новым Статуце, прынятым з улікам заўваг Прэзідэнта краіны.

Як вядома, у лістападзе-снежні мінулага года на ўсіх факультэтах універсітэта праводзілася комплексная кантрольная работа рэктарата, якая ставіла сваёй мэтай праверку адпаведнасці зместу і якасці адукацыі патрабаванням Дзяржаўнага стандарту. Аб выніках гэтай работы паведаміў на Савеце прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар С.Ф. Каморнікаў.

Па інфармацыі дэкана завочнага факультэта М.Н. Мурашкі зацверджаны вучэбныя планы спецыяльнасцей факультэта.

Вылучаны кандыдатуры студэнтаў для назначэння ім стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь – пяцікурсніка эканамічнага факультэта Сяргея Каморнікава і студэнткі 4 курса факультэта замежных моў Ірыны Логвінавай. Назначаны 7 імянных стыпендый, а таксама заахвочвальныя стыпендыі імя М.В. Доўнар-Запольскага студэнтцы 4 курса гістарычнага факультэта Алене Абраменка і пяцікурсніцы эканомфака Аліне Арловай. Кандыдатура трэцякурсніка геолага-геаграфічнага факультэта Юрыя Шульжэнкі рэкамендавана для ўдзелу ў конкурсе на назначэнне стыпендыі імя акадэміка В.І. Вярнадскага. Па гэтым пытанні выступіла начальнік вучэбнага аддзела Н.І. Папкова.

На конкурснай аснове на займаемыя і вакантныя пасады выбраны і перавыбраны прафесарска-выкладчыцкі састаў: член-карэспандэнт НАН Б, д.б.н., прафесар Р.Р. Ганчарэнка – загадчыка кафедры заалогіі і аховы прыроды, дацэнт У.П. Бабына – загадчыка кафедры бухуліку і АГД, дацэнт А.Ф. Каморнікаў – загадчыка кафедры ВМ і праграміравання, А.М. Скіба – прафесара кафедры алгебры і геаметрыі. Савет хадайнічаў перад ВАКам Беларусі аб прысваенні вучонага звання дацэнта Н.У. Суславай з кафедры рускай літаратуры і Т.А. Міхалкінай з кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства.

Па інфармацыі вучонага сакратара В.Ю. Залатарэнкі ўнесены змены ў Статут ГДУ, якія датычаць мэт і прадмету дзейнасці універсітэта.

Рэктар ГДУ прафесар М.В. Селькін расказаў аб сваёй рабоце сенатара ў камісіі па заканадаўству і дзяржаўным будаўніцтве Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Аб адлічэнні на сацыяльныя патрэбы сродкаў, выдзеленых з рэспубліканскага бюджэту на выкананне НДР у 2003 годзе, адкрыцці часовых навуковых калектываў праінфармаваў начальнік НДС В.Р. Сафонаў.

## ВКЛЮЧАЕМСЯ В ЦЕНТРАЛИЗОВАННОЕ ТЕСТИРОВАНИЕ

Новая белорусская национальная модель образовательной системы предполагает широкое практическое применение государственного централизованного тестирования, которое является одной из наиболее эффективных форм контроля знаний и способствует снижению психофизических нагрузок у выпускников средней школы. В случае успешной сдачи тестовых заданий они не только имеют право на освобождение от выпускного экзамена по предмету тестирования, но и на зачтение его результата в качестве вступительного испытания в вузы республики. Иными словами, имеющие соответствующую подготовку абитуриенты существенно сокращают сверхтрудную, поистине марафонскую дистанцию, в которую входят традиционные выпускные и вступительные экзамены. Вот почему с каждым годом все больше выпускников школ стремятся проверить уровень своих знаний, принимая участие в централизованном тестировании.



Как известно, в 2003 году Министерство образования Республики Беларусь значительно расширило список специальностей, на которые будут приниматься результаты централизованного тестирования. Увеличено и количество их центров. Впервые в систему тестирования включается и ГГУ им. Ф. Скорины. Сейчас у нас осуществляется целый комплекс мероприятий, направленных на то, чтобы каждый тестируемый имел все возможности для максимального проявления своих знаний. В рамках подготовительных курсов *(корпус 5, ауд. 1-2, тел. 57-92-21)* проводится подготовка к тестированию. Все желающие смогут участвовать в репетиционном тестировании. Его результаты не являются официальными, а организационно-содержательный опыт репетиционного тестирования позволит учащимся лучше подготовиться к государственному централизованному тестированию.

**Уже утверждены даты и продолжительность его проведения по отдельным предметам:** ***русский язык – 30 марта, воскресенье (90 минут); белорусский язык – 6 апреля, воскресенье (90 минут), химия – 19 апреля, суббота (120 минут); физика – 20 апреля (180 минут); биология – 3 мая, суббота (120 минут); математика – 4 мая, воскресенье (135 минут).***

Пока точно не определена стоимость тестирования по одному предмету, но, по словам директора Республиканского института контроля знаний Н.С. Феськова, она в долларовом эквиваленте будет примерно на уровне 2002 года, или 10 долларов США.

**Продажа посадочных талонов участников тестирования 2003 года начнется 1 марта.**

Планируется, что **сертификаты с результатами** централизованного тестирования **будут выданы** его участникам **до 20 мая 2003 года**, т. е. до начала выпускных экзаменов в средних школах, гимназиях и лицеях.

**Сергей ХАНЕНЯ, зам. отв. секретаря приемной комиссии ГГУ им. Ф. Скорины.**

Культурнае жыццё

# ЗІМОВЫ СЕЗОН "ДЗЯННІЦЫ"

**Месяц студзень стаўся для народнай харавой капэлы "Дзянніца" нашага універсітэта насычаным на выступленні.**

Напярэдадні Ражства Хрыстова яна атрымала запрашэнне ад кіраўніка ўзорнага хору дзіцячай Школы мастацтваў г. Светлагорска А.П.Еўсюкова прыняць удзел ва ўрачыстым канцэрце, прысвечаным гэтаму праваслаўнаму святу. Мерапрыемства такога кшталту раней не мела аналагаў: шасці творчым калектывам неабходна было сумесна выканаць некалькі твораў, што, безумоўна, патрабавала належнай вакальнай падрыхтоўкі і не менш добрай скаардынаванасці дзеянняў. Таму спачатку была праведзена сумесная рэпетыцыя, а на наступны дзень удзельнікі капэлы наведалі праваслаўны храм Пятра і Паўла і па запрашэнні айца Ігара выканалі перад прыхаджанамі шэраг духоўных песнапенняў. Трэба зазначыць, што яшчэ перад паездкай у г. Светлагорск "Дзянніца" атрымала ад епіскапа Гомельскага і Жлобінскага Арыстарха блаславенне на выступленне, бо ніколі раней свецкі калектыў не пераступаў парог гэтага храма.

Свaім пранікнёным выкананнем удзельнікі капэлы выклікалі слёзы замілавання на вачах вернікаў. Не менш цёплым быў прыём, аказаны "Дзянніцы" падчас выступлення на канцэрце, які адбыўся ў той жа вечар у Школе мастацтваў. У зале не было свабодных месцаў, і калі змоўклі апошнія гукі акордаў, зала ўзарвалася ад апладысментаў. Нязменны кіраўнік калектыву Мікалай Казлоў атрымаў кветкі, а разам з імі і цёплыя словы ўдзячнасці ад сваіх калег-музыкаў, а таксама ад гледачоў.

***

Адразу ж пасля паездкі ў г.Светлагорск "Дзянніцы" прапанавалі выступіць з сольнай праграмай у г. Гомелі. З новымі сіламі пачалася падрыхтоўка да яе. Вельмі праблематычным уяўлялася сабраць поўную залу гледачоў у нядзелю, ды яшчэ і на свята Вадохрышча. Але ўвечары, 19 студзеня, амаль усе месцы ў канцэртнай зале ГЦК былі заняты сапраўднымі аматарамі харавой музыкі.

"Дзянніца" вынесла на суд слухачоў не толькі харавыя спевы, але і рамансы ў выкананні салістаў хору Юрыя Пазняка, Іны Бабічавай і Ганны Мальцавай. Дарэчы, для Іны і Ганны гэта быў дэбют.

Мяркуючы па тых словах, якія гучалі ў прыватных размовах пасля канцэрта, слухачы шкадавалі, што ён доўжыўся так мала – усяго гадзіну. А гэта – яскравае падцвярджэнне творчага поспеху "Дзянніцы".

**Ігар ВОДНЕЎ,**
**студэнт 5-га курса гістарычнага факультэта.**

ВПЕРВЫЕ В ГОМЕЛЕ

# СПЕШИТЕ В КИНО!

Не секрет, что этот некогда самый массовый вид искусства сейчас претерпевает значительные трудности: телевидение, Интернет составляют ему большую конкуренцию. Поэтому нет той прежней заполненности зрительных залов, не услышишь возле кинотеатров вопросов о лишнем билетике на сеанс нашумевшего фильма. Да и материальные возможности у большинства людей, к сожалению, теперь уже не те.

Но, как бы там ни было, все же душа человека жаждет духовной пищи, которую предоставляет магия кино, и часто хочется насладиться прекрасной игрой любимых актеров, зрелищностью, масштабностью съемок именно в зале кинотеатра.

Такую прекрасную возможность сейчас предоставляет кинотеатр «Юбилейный» Молодежного комплекса нашего университета. Он претерпел технические изменения и теперь кинозритель может посмотреть фильмы в формате «Долби» (Dolby Digital Surround EX). Он представляет собой высококачественный цифровой стереозвук, который совершил революцию в киноиндустрии. Благодаря новой технологии записи и воспроизведения 5 основных каналов звука (левый, центральный, правый, окружающий и т.д.) зритель как бы ощущает эффект присутствия при всех действиях фильма.

В этом новом звуковом формате фильмы демонстрируются только в «Юбилейном», в других кинотеатрах г. Гомеля и области аналогов пока что нет. Используют эту новинку еще в столице республики – г. Минске, а также в Бресте и Гродно.

С середины января этого года в кинотеатре «Юбилейный» идет показ премьерных фильмов производства США, Франции, Великобритании, Германии и др. Так, многие зрители уже оценили по достоинству новую звуковую систему «Dolby» при просмотре суперзрелищных, фантастических, приключенческих, драматических фильмов «Машина времени», «Царь скорпионов», «Властелин колец: братство кольца», «Гарри Поттер и тайная комната» и др.




Цена билетов – 2 тыс. руб. (в любом ряду), на льготные сеансы для всей семьи 1 тыс.руб., на детские киносеансы – 600 руб.

***

В воскресенье, 9 февраля, в кинотеатре состоялся премьерный показ остросюжетного фильма «К-19: оставляющая вдов» в новом звуковом формате. На этот сеанс ректорат и Молодежный комплекс университета пригласили руководящих работников, общественность города, представителей ВУЗов и др. Перед его началом выступил ректор ГГУ профессор М.В.Селькин, который отметил, что культурный центр «Юбилейный» является одним из лучших на сегодняшний день в нашем городе по своей технической оснащенности и дает прекрасную возможность не только студентам и сотрудникам ГГУ, а также жителям всего микрорайона интересно проводить здесь свой досуг.

*Посетите кинотеатр «Юбилейный» и по настоящему погрузитесь в мир современного кино.*

**Тел. для справок: кассы – 56-74-95, директор – 56-75-86, автоответчик – 57-56-69.**

О проблеме курения

# ДЫМ, УНОСЯЩИЙ ЗДОРОВЬЕ И... ДЕНЬГИ

**Согласно пункта 50 Правил внутреннего распорядка университета и приказа ректора №988 к-3 от 8.11.2000 года, *запрещается курение во всех учебных корпусах, на крыльце и в общежитиях ГГУ им. Ф.Скорины.***

**За нарушение будут применены дисциплинарные взыскания, согласно п.п. 36, 41 Правил внутреннего распорядка университета.**

Выработка политики в отношении курения волнует администрацию многих вузов. Причина кроется в заботе об осуществлении прав не только курящих, но и некурящих. Эта проблема решается как на уровне отдельно взятого учреждения образования, так и на государственном. Наш университет не является в этом плане исключением. Пункты о запрете курения внесены в следующие основные нормативные документы:

**– Правила внутреннего распорядка ГГУ имени Ф.Скорины (гл. IX, § 50);**

**– Положение о студенческом общежитии ГГУ имени Ф.Скорины (гл. III, § 10, п. в);**

**– Правила внутреннего распорядка в студенческом общежитии ГГУ имени Ф.Скорины (гл. V, § 4, п. в);**

**– приказ ректора № 988 к-з от 8.11.2000г.: п. 9: «Запретить курение во всех учебных корпусах, в том числе и на крыльце. Курение в корпусе считать грубым нарушением правил внутреннего распорядка».**

Государство также не остается в стороне от этой важной проблемы. 17 декабря 2002 года вышел Декрет Президента Республики Беларусь № 28 «О государственном регулировании производства, оборота, рекламы и потребления табачного сырья и табачных изделий», вступивший в силу 1 января 2003г. В разделе «Государственное регулирование потребления табачных изделий» в п. 38 записано: «запрещается курение (потребление) табачных изделий (за исключением мест, специально предназначенных для этой цели): в учреждениях (организациях) здравоохранения, культуры, образования, спорта и т.д.».

Но несмотря на данные запреты, многие студенты продолжают курить в учебных корпусах и общежитиях. Не является исключением в этом плане общежитие № 1 (по ул. Советской, 83а), где 28 января при проверке сотрудниками милиции была замечена студентка 5 курса филологического факультета Наталья Вопсева, которая курила в неустановленном месте. Согласно названного Декрета виновный наказывается штрафом от 0,1 до 0,5 базовой величины. По горячим следам в этот же день воспитатели общежития провели общее собрание, на которое были приглашены начальник отдела воспитательной работы Г.И Воронин, социальный педагог отдела воспитательной работы М.Н. Бардашевич, старший участковый инспектор В.М. Савчиц и участковый инспектор по делам несовершеннолетних А.М. Прохоренко. Со стороны студентов сотрудникам правоохранительных органов была задан целый ряд вопросов, касающихся курения, распития спиртных напитков, наркомании и поведения в общественных местах, на которые они получили исчерпывающие и квалифицированные ответы.

> «...запрещается курение (потребление) табачных изделий (за исключением мест, специально предназначенных для этой цели)». За нарушение виновный наказывается штрафом от 0,1 до 0,5 базовой величины.

Теперь немного информации для «принятия к сведению». В БГУ за курение студенту грозит строгий выговор или отчисление, в БГУИРе за курение в корпусе – хозяйственные отработки, в общежитии – лишение права проживания. А в Европейском гуманитарном университете студента могут лишить скидок при оплате за обучение. Для сравнения – в Австралии курить разрешено не ближе 5 метров от входа в здание. В Иордании курить можно в специально отведенных местах за 280$. Студентам христианского университета штата Юта (курение запрещено) – штраф 1000$. В Софийском Университете национальной и мировой экономики студентов исключают на 1 год за курение в неположенных местах. Запрещено курить даже на улицах Токио и в некоторых городах Польши.

В развитых странах Европы и Америки бум на курение прошел несколько десятилетий назад. По статистике количество курящих уменьшается с каждым годом. А у нас наоборот. И удручает больше всего тот факт, что прекрасная половина нашего вуза, будущие педагоги и матери, увлекаются сигаретами больше, чем юноши.

Вы молоды, красивы, без пяти минут с высшим образованием и ... курите? Наверное, вы еще не знаете о том, что курение нынче не в моде.

**В.ВОРОЧАЙ, Ж.ПЛЮТА,**
**воспитатели общежития №1,**
**Е.НАЗАРЕНКО,**
**педагог-организатор.**

# ПРИЗНАВАЙТЕСЬ В ЛЮБВИ

**Праздник всех влюбленных насчитывает в своей истории больше 18 веков. В то время император Клавдий II собирался покорять мир, но римская армия испытывала острый недостаток солдат для военных походов, что мешало воинственным планам. Корень зла Клавдий II видел в браке и поэтому запретил обряд венчания. Но нашелся все таки смельчак епископ Валентин, который смог пренебречь запретом тирана. Обряды стали совершаться тайно. Император быстро узнал имя виновника и бросил его в тюрьму.**

*14 февраля – День Святого Валентина*

За несколько дней до казни к Валентину привели девушку, дочку одного из тюремщиков, которая была тяжело больна. Используя свой целительный дар, Валентин излечил ее, но ему самому уже нельзя было помочь. Казнь назначили на 14 февраля. За день до нее Валентин попросил у тюремщика бумагу, ручку и чернила и быстро написал девушке прощальное письмо. 14 февраля 270 года его казнили. А девушка открыла записку, где Валентин написал о своей любви и подписал "Твой Валентин". Было это так или иначе, но отсюда записки в день Святого Валентина выглядят совершенно естественным и даже необходимым, традиционным шагом.

В 496 году римский папа Геласиус объявил 14 февраля днем Святого Валентина. С тех пор влюбленные почитают Святого Валентина и считают его своим заступником. В этот день очень популярно устраивать свадьбы и венчаться. Говорят, что это залог вечной любви.

В каждой стране отмечают День Святого Валентина по-своему. Например, в средневековой Англии был распространен обычай выбирать себе «Валентину». Несколько молодых людей собирались вместе, писали на кусочках пергамента имена девушек, складывали их в шапку и тянули жребий. Та девушка, имя которой выпадало юноше, на целый год становилась его «Валентиной», а он ее «Валентином». «Валентин» слагал своей девушке сонеты, играл ей на лютне, повсюду сопровождал, - словом, вел себя, как настоящий рыцарь. Именно этот обычай воспевала шекспировская Офелия в своей знаменитой песне.

Галантные французы первые ввели у себя «валентинки» - любовные послания-четверостишья.

В Японии проводят мероприятие - «самое громкое любовное признание» - на помост взбираются юноши и девушки и по очереди кричат изо всех сил всевозможные любовные признания. Победителю вручают приз.

***

**Студенческий клуб ГГУ проводит завтра праздничную шоу-программу и дискотеку, посвященные Дню влюбленных.**

## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

– эканамічных тэорый – дацэнта;
– агульнай фізікі – дацэнта;
– геаграфіі – дацэнта;
– ВМ і праграміравання –прафесара.

Тэрмін падачы заяў – не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

**Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.**

**РЭКТАРАТ.**

Удакладненне:

У папярэднім нумары нашай газеты за 22 студзеня г.г. трэба было чытаць: ГДУ аб'яўляе конкурс на замяшчэнне 2-х вакантных пасад ст.выкладчыка па кафедры фізічнага выхавання і спорту.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК — Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 2-14. Тэл. 56-30-71. E-mail: rggu@gsu.unibel.by
Зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263.

Спонсар газеты — прафкам студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1. Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

РЭДАКТАР Тамара ДУБЯК

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 4065
Падпісана да друку 11.02.2003 г.